Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(63), 2010

*УДК 070(091):947.6*

# Асаблівасці арганізацыі беларускай і ўкраінскай эканамічнай хвалі эміграцыі (1918–1939 гг.)

В. У. Коваль

Тэма ўзаемасувязей беларускай і ўкраінскай эміграцыі з’яўляецца актуальнай і запатрабаванай. Для прадстаўнікоў беларускай дыяспары кантакты з украінскімі эмігрантамі мелі важнае значэнне ў развіцці палітычнай і культурнай актыўнасці, асабліва яскрава яны праявіліся ў міжваенны час. Даследаванне арганізацыі эканамічнай хвалі эміграцыі беларусаў і ўкраінцаў можа пашырыць сучаснае ўяўлянне пра гісторыю беларускай дыяспары, дазволіць патлумачыць прычыны шчыльных сувязей паміж народамі ў розных краінах свету.

Тэма гісторыі ўкраінскай эміграцыі на сённяшні дзень актыўна распрацоўваецца вядучымі гісторыкамі Украіны. Асноўным спецыялістам у дадзенай тэматыцы з’яўляецца прафесар С. П. Качараба, які падрабязна апісвае ў сваёй манаграфіі асаблівасці міжваеннай эканамічнай хвалі эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Украіны [1]. Пры вывучэнні беларускіх эміграцыйных працэсаў аўтар спасылаецца ў асноўным на архіўныя матэрыялы, бо дадзеная тэматыка слаба прадстаўлена ў сучаснай гістарыяграфіі. У артыкуле былі выкарыстаны дакументы айчынных і замежных архіваў: Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Архіва новых актаў Польшчы, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны ў г. Львове.

Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна былі ўключаны ў склад польскай дзяржавы, гэтак званай Другой Рэчы Паспалітай. Да верасня 1939 г. заходнебеларускія і заходнеўкраінскія рэгіёны палякі ператварылі ў адстаючыя аграрна-сыравінныя раёны. На развіццё тэрыторый негатыўны ўплыў аказвала перанаселенасць вёскі і дыскрымінацыйная палітыка ў дачыненні да беларускага і ўкраінскага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы.

Паступова распачалі сваю дзейнасць разнастайныя дзяржаўныя эміграцыйныя органы, якія аналізавалі ролю і ўплыў эміграцыі на палітычную і эканамічную сітуацыю ў краіне. Яны прыйшлі да высновы, што менавіта пры дапамозе эміграцыйных працэсаў можна было знізіць працэнт нацыянальных меншасцей у Польшчы, таму дастаткова хутка былі створаны спрыяльныя ўмовы для выезду беларускага і ўкраінскага насельніцтва з тэрыторый дзяржавы. Таксама пры дапамозе эміграцыі польскія чыноўнікі спрабавалі вырашыць праблему перанаселенасці сельскагаспадарчых рэгіёнаў. Па іх меркаванні, вызваленыя землі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне неабходна было прадаваць выключна палякам па нацыянальнасці.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў розныя перыяды дзейнічалі наступныя арганізацыі эміграцыйнага апарата: аддзел Дзяржаўнага ўпраўлення спраў звароту палонных, бежанцаў і працоўных; эміграцыйнае ўпраўленне; Дзяржаўнае ўпраўленне пасрэдніцтва працы і апекі над эмігрантамі. Важная роля ў арганізацыі эміграцыйных працэсаў беларусаў і ўкраінцаў ускладалася на Экспазітуры эміграцыйнага ўпраўлення, якія працавалі ў Брэсце, Львове, Беластоку і Варшаве [2, л. 154]. Польскі эміграцыйны апарат падлягаў рэарганізацыі, у выніку чаго ўрад Польшчы здолеў, асабліва ў 1930-я гады, кіраваць і кантраляваць дынамікай эміграцыі. Дакументы Архіва новых актаў у Варшаве сведчаць, што эміграцыйнымі пытаннямі ў Польшчы непасрэдна займалася Міністэрства замежных спраў, а таксама Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння.

У структуры польскіх эміграцыйных органаў асаблівую ролю выконваў Варшаўскі эміграцыйны сіндыкат, які ў 1930 г. меў 11 агентур у Валынскім ваяводстве, 7 – у Палескім, 5 – у Львоўскім [3, с. 102]. Цэнтральны сіндыкат дзейнічаў у Варшаве. Варшаўскі сіндыкат меў свае аддзелы па ўсёй тэрыторыі Польшчы, яны актыўна працавалі ў Брэсце, Львове, Ко-

велі, Роўна, Луцку, Пінску, Станіслававе, Чарткове, Пшэмысле, Тарнопалі [4, л. 11]. Аддзелы сіндыката не заўсёды былі аднолькавымі. Здараліся выпадкі, калі супрацоўнікі аднаго аддзела не мелі магчымасці выконваць пэўную функцыю, таму грамадзяне былі вымушаны звяртацца ў суседні сіндыкат. Напрыклад, Эміграцыйны сіндыкат у Варшаве інфармаваў сіндыкат Пінска, што па прычыне тэхнічных цяжкасцей інспектар з Варшавы не можа зрабіць адбор сем'яў для эміграцыі ў Канаду ў пінскім сіндыкаце, таму сем'і павінны прыехаць для працэдуры ў Брэст [5, л. 5].

На аснове архіўных дакументаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці можна зрабіць высновы пра шчыльнае супрацоўніцтва Брэсцкага, Пінскага і Львоўскага сіндыката. Супрацоўнікі сіндыкатаў у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне былі ў асноўным палякамі па нацыянальнасці. Яны падтрымлівалі асабістыя кантакты, абменьваліся вопытам, мелі агульных партнёраў. Былі выпадкі, калі прадстаўнікі аднаго сіндыката прадстаўлялі інтарэсы сваіх суседзяў. Напрыклад, Львоўскі сіндыкат часам выступаў таксама ад імя Пінскага і Брэсцкага ў Цэнтральным сіндыкаце ў Варшаве [6, л. 64].

Для характарыстыкі значэння эміграцыйнага сіндыката для ўрада Польшчы і эміграцыйных працэсаў можна прывесці ўрывак з пратакола міжміністэрскай камісіі ад 20 сакавіка 1936 г.: "У дыскусіі слова ўзяў міністр гандлю Ацяшынскі, які распавёў пра праблему перавозу эмігрантаў у Бразілію. Фірма, якая ажыццяўляе перавоз, не належыць да эміграцыйнага сіндыката. Гэта фірма можа стварыць моцную канкурэнцыю "Лініі Польскай", бо прапануе нізкі кошт квіткоў 130 злотых, каб даехаць ад Гамбурга да Бразіліі" [7, л. 4]. На дадзеным пасяджэнні кіраўнікі міністэрстваў падрабязна разглядалі пытанне абароны фінансавых інтарэсаў эміграцыйнага сіндыката ў Польшчы. У Міжміністэрскую камісію ўваходзілі Прэзідыум Рады Міністраў, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства сацыяльнага забеспячэння, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства прамысловаці і гандлю, Міністэрства фінансаў [8, л. 198]. Камісія намагалася ацэньваць наступствы і вынікі эміграцыйных працэсаў у 1930-ыя гады ў міжваеннай Польшчы. На пасяджэннях Міжміністэрскай камісіі прымаліся асноўныя дзяржаўныя рашэнні па формах арганізацыі эміграцыі.

Развіты апарат чыноўнікаў у міжваеннай Польшчы павінен быў спрыяць вырашэнню эканамічных праблем дзяржавы. Кожная структура мела ўласныя, дакладна вызначаныя функцыі. Напрыклад, у рамкі дзейнасці Экспазітур уваходзіла: 1) выданне пасведчанняў для эміграцыйнага замежнага пашпарта; 2) адкрыццё віз на эміграцыйныя пашпарты; 3) падцвярджэнне дакументаў эмігрантаў для атрымання віз (напрыклад, для Аргенціны); 4) кантроль за дзейнасцю карабельных таварыстваў; 5) выданне дазволу карабельным таварыствам [9, л. 154]. Эміграцыйныя органы павінны былі не толькі арганізоўваць выезд грамадзян з Польшчы, але і абараняць іх правы за мяжой. Згодна заканадаўству, эмігранты з тэрыторыі міжваеннай Польшчы маглі за дапамогай у складанай сітуацыі звяртацца ў польскія амбасады і консульствы. Міністэрства працы і сацыяльнай апекі Другой Рэчы Паспалітай павінна было аплочваць ў выпадку неабходнасці рэпатрыяцыю на радзіму хворага грамадзяніна Польшчы [10, л. 3]. На жаль, далёка не ва ўсіх краінах свету дадзены закон спрацоўваў. Працэдура дэпартацыі хворых замежнікаў была падрабязна прапісана ў дакуменатах Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, у такім выпадку за асобу плаціў урад яго дзяржавы [11, л. 5].

Эміграцыйны апарат Другой Рэчы Паспалітай у міжваенны час намагаўся выпрацаваць сістэму сацыяльнай абароны сваіх грамадзян у розных краінах свету, аднак вынікі былі неаднолькавыя. У Еўропе аказалася прасцей адсочваць і вырашаць праблемы эмігрантаў, больш складаная сітуацыя склалася ў Аргеніне, Парагваі, Бразіліі і Уругваі, асабліва ўскладніла становішча людзей там беспрацоўе і эканамічны крызіс. Украінская эміграцыйная газета "Грамадскі голас" апісвала жыццё эмігрантаў ў Аргеніцне ў 1932 г. наступным чынам: "Каля гарадоў і мястэчак галадаючыя асядаюць цэлымі табарамі. Жывуць з таго, што горад выкідае на сметнік. Ажно страшна праходзіць па вуліцы зранку. Як сабакі, завіхаюцца людзі на сметніках, каб знайсці сабе кусок ежы і тым выратавацца ад галоднай смерці" [12, с. 223]. Нягледзячы на перасцярогі, беларускія і ўкраінскія сяляне працягвалі выязжаць за мяжу, каб зарабіць сабе грошай і набыць уласны кавалак зямлі. Эканамічныя цяжкасці, з якімі людзі сустракаліся на радзіме, прымушалі іх шукаць лепшай долі за мяжой.

Эміграцыйныя сіндыкаты займаліся распаўсюджваннем інфармацыі сярод насельніцтва пра ўмовы эміграцыі і афармлення дакументаў на выезд. Іх агітацыйная работа асабліва актывізавалася ў 1930-ыя гады. Сярод сялян распаўсюджваліся лістоўкі пра эміграцыю, расклейваліся плакаты, выдаваліся брашуры пра краіны свету. Напрыклад, у лістоўцы пра эміграцыю ў Аргенціну Эміграцыйнага сіндыката пазначалася: "Хто цікавіцца эміграцыяй, няхай прачытае сам дадзеную інфармацыю і перадасць іншаму прачытаць" [13, л. 36]. Выдаўцы агітацыйнага матэрыялу намагаліся максімальна распаўсюдзіць звесткі пра тэрытарыяльныя ўмовы і клімат Аргенціны, яе насельніцтва, камунікацыі, кошты праезду. Згодна дадзенай інфармацыі, удакладніць нешта можна было ў прадстаўніка сіндыката, які мог дапамагчы ў справе эміграцыі, былі арганізаваныя кансультацыйныя паслугі насельніцтву: "Пры кожным гмінным упраўленні знаходзіцца карэспандэнт ці прадстаўнік Эміграцыйнага сіндыката. Звяртайцеся да яго за інфармацыяй і дапамогай у эміграцыйнай справе" [14, л. 36], – пазначалася ў лістоўцы. Безумоўна, лістоўкі павінны былі пашырыць звесткі сярод сялян пра выезд за мяжу, павялічыць колькасць жадаючых эмігравать, таму прынесці дадатковы прыбытак сіндыкатам.

Жаданне зарабіць грошы за мяжой прымушала некаторых эмігрантаў распрацоўваць сабе механізмы афер. Безумоўна, эміграцыйныя чыноўнікі адсочвалі магчымыя схемы нелегальных прыбыткаў грамадзян. Чуткі пра добрыя заробкі эмігрантаў у Францыі выклікалі вялізны ажыятаж і жаданне туды паехаць, таму легальна аформіць дакументы было дастаткова складана. Эміграцыйнае ўпраўленне адзначала ў лісце да Экспазітур: "Неаднаразова здараліся выпадкі выезду ў пошуках працы рабочых з Польшчы ў Францыю ў якасці турыстаў на Міжнародную каланіяльную выставу ў Парыжы, на якую французскія консульства ахвотна выдаюць візы" [15, л. 10]. Дадзены прыклад сведчыць пра магчымыя шляхі афармлення дакументаў для эміграцыі пасля пачатку сусветнага эканамічнага крызісу, калі большасць краін свету максімальна абмежавала эміграцыйныя патокі. Людзі жадалі абысці закон, каб стварыць сабе лепшыя эканамічныя ўмовы жыцця.

Казка пра лепшую долю за мяжой прымушала сялян ехаць абсалютна без аніякага ўяўлення пра іншую краіну. Эмігранты часта не ведалі нічога пра мову, культуру, рэлігію, традыцыі краіны-рэцэпіента, нават не ўяўлялі курсы валют, таму не суадносілі свае матэрыяльныя магчымасці. Пра дадзеную сітуацыю неаднаразова пісалі польскія консульствы ў Эміграцыйнае ўпраўленне. Напрыклад, консультсва Рэчы Паспалітай ў Францыі пазначала: "Ад нядаўняга часу павялічылася колькасць эмігрантаў, якія едуць індывідуальна ў Францыю без дастатковай сумы грошаў для сваёй паездкі. Датычыцца гэта асабліва жанчын з малымі дзецьмі і вялікім багажом, якія едуць да свайго мужа, працуючага ў Францыі" [16, л. 71]. Супрацоўнікі консультсва ў афіцыйным лісце цудоўна праілюстравалі апісаную тэндэнцыю: "Тыповым прыкладам можа быць справа сям'і Тэклы Грамады, якая ехала з 4 дзецьмі і 400 кг багажом да ля Рашэля, мела толькі 30 франкаў, у той час, калі сума на аплату білетаў і правозу багажа складала 1.400 франкаў" [17, л. 71]. Толькі вялізнае жаданне змяніць сваё жыццё прымушала жанчын ісці на рызыку і адпраўляцца з дзецьмі фактычна без грошаў у такія вандроўкі. Консульства Рэчы Паспалітай у Францыі намагалася дапамагаць жанчынам, арганізоўвала начлег, звязвалася са сваякамі, давала пазыкі, часткова аплочвала падарожжа, аднак дыпламаты прасілі Эміграцыйнае ўпраўленне прыняць меры, каб не дапусціць такіх выпадкаў.

Жаданне сэканоміць і прывезці болей грошаў дадому прымушала сезонных эмігрантаў у Францыі выкарыстоўваць схемы афер з рэпатрыяцыяй. Сацыяльную падтрымку эмігрантаў з Польшчы за мяжой некаторыя асобы навучыліся выкарыстоўваць сабе на карысць. Квіткі з Францыі дадому каштавалі шмат для сялян, таму некаторыя з іх даведаліся пра асаблівасці эміграцыйнага заканадаўства і выкарыстоўвалі магчымасць неаднаразовай рэпатрыяцыі з тэрыторыі Францыі за кошт польскай дзяржавы. Сезонныя эмігранты такім чынам эканомілі на зваротным білеце, што для іх было нямала. Эміграцыйнае ўпраўленне ў 1931 г. заўважыла тэндэнцыю паўтарэння рэпатрыяцыі аднымі і тымі ж асобамі і намагалася прымаць меры, каб такія эмігранты больш не мелі магчымасці выехаць за мяжу ў пошуках заробкаў [18, л. 58].

Дакументацыя Эміграцыйных сіндыкатаў дакладна сведчыць аб непадрыхтаванасці эмігрантаў да цяжкога падарожжа і наладжвання жыцця ў чужой краіне. Дастаткова часта людзі збіраліся ў эміграцыю, аднак не мелі інфармацыі пра асаблівасці пераезду. Пасажырскі

аддзел Эміграцыйнага сіндыката ў Варшаве рассылаў інфармацыю да ўсіх агентур і аддзелаў: "Неабходна заўважыць, што багаж эмігратаў прыбывае ў знішчоным стане, бо ў большасці выпадкаў ён запакаваны ў сундукі з фанеры ці ў прагнілыя сундукі. Заўважым, што роверы адпраўляюцца зусім не запакаванымі, а павінны быць у скрынях. То самае са швейнымі машынкамі. Пілы часта проста абматаныя паперай" [19, л. 56]. Сяляне не мелі аніякага ўяўлення пра адпраўку і транспарціроўку багажа караблямі, таму часта самі былі вінаватымі ў знішчэнні ўласных рэчаў. Безумоўна, зламаная швейная машынка ці піла для небагатага эмігранта за мяжой здавалася трагедыяй.

Польскія эміграцыйныя ўлады для стымулявання працэсаў выезду за мяжу распрацавалі сістэму крэдытавання жадаючых эміграваць. На думку польскіх чыноўнікаў, такая сістэма павінна была прыносіць дадатковы прыбытак дзяржаве, бо зарабляючы грошы за мяжой, эмігранты павінны былі вяртаць суму з працэнтамі. Распрацоўкай сістэмы выдачы крэдытаў займаліся чыноўнікі ўсіх узроўняў. Было вырашана даваць крэдыт кароткатэрміновы, да 50% ад сумы карабельнай карты эмігранта [20, л. 21]. Сістэма выдачы крэдытаў для эміграцыі атрымала сваё распаўсюджанне ў 1930-ыя гады. Нягледзячы на шырокае абмеркаванне дэталяў крэдытавання сярод эміграцыйных чыноўнікаў рознага ўзроўню, некаторыя сяляне бралі крэдыт для эміграцыі, але пускалі грошы на развіццё сваёй гаспадаркі. Пасля атрымання грошаў некаторыя сяляне і іх сем'і так і не выязжалі за мяжу. Крэдыт на ільготных умовах для эміграцыі дазваляў сялянам атрымаць дадатковы прыбытак, а эміграцыйныя структуры вымушаны былі адсочваць такія выпадкі і намагацца іх не дапускаць.

Важную ролю ў арганізацыі эміграцыйнага руху адыгрывалі мараплаўныя кампаніі, якія працавалі на тэрыторыі міжваеннай Польшчы. Ад актыўнасці работы агентаў карабельных таварыстваў залежыла інтэнсіўнасць эміграцыйных працэсаў. Мараплаўныя таварыствы былі зацікаўленыя ў жаданні сялян эміграваць за мяжу, бо ад гэтага непасрэдна ўзрастаў іх прыбытак. На тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны прадстаўнікі кампаній праводзілі асабліва актыўную агітацыю сярод сялян, намагаючыся заахвоціць іх да пераезду, што спрыяльна ацэньвалася польскімі ўладамі.

Карабельныя таварыствы вымушаны былі канкурыраваць за сваіх пасажыраў, бо на тэрыторыі Польшчы ажыццяўлялі сваю дзейнасць шматлікія кампаніі з розных краінаў свету. Для эмігрантаў выпускаліся спецыяльныя рэкламныя матэрыялы, якія змяшчалі інфармацыю пра ўзровень сэрвісу, зніжкі, спецыфіку падарожжа. Прыкладам можа быць рэклама французскага таварыства "Chargeurs Reunis" [21, л. 72], дзе падрабязна тлумачылася, як знайсці яго офісы. Таварыства мела свае афіцыйныя прадстаўніцтва ў Варшаве, Гданьску, Тарнопалі, Львове, Любліне, Ковелі, Вільні і Пінску. Разгалінаваная сетка кампаніі павінна была пераканаць кліентаў у яе сур'ёзнасці, да таго ж, гэта было зручна насельніцтву Польшчы ў розных рэгіёнах.

Асноўнымі супрацоўнікамі таварыстваў, якія шукалі кліентаў, былі агенты кампаній. Ад колькасці афармленых пасажыраў на караблі залежыў заробак кожнага агента, таму яны праводзілі актыўную агітацыю сярод сялянаў у перанаселеных вёсках. Большасць агентаў паходзіла з ліку мясцовых жыхароў. Яны добра ведалі праблемы насельніцтва і мары гаспадароў аб ладным кавалку ўласнай зямлі, што часта выкарыстоўвалася ў маніпуляцыях пачуццямі людзей, каб заахвоціць іх ехаць на чужыну. У пратаколе аб парушэнні правіл эміграцыі ад 2 снежня 1927 г. украінскія сяляне Стэфан Яраш і Тадор Яраш падрабязна апісалі механізм заахвочвання агентамі сялян: "Тры тыдні таму выехалі да Дабраміла на кірмаш, на рынку спаткалі групу людзей, сярод якіх нейкі Міхалка (прозвішча не ведаем) з вёскі Петніцэ пад Дабрамілам. Ён распавёў сабраўшымся, што хто хоча ехаць у Аргенціну, няхай ідзе ў французскае бюро, якое з'яўляецца найлепшым для людзей з Польшчы. У Аргенціне вельмі добры заробак і можна ў хуткім часе зарабіць сабе на маёнтак. Калі мы пачулі аповед, з'явілася вялікае жаданне туды паехаць" [22, л. 27]. Агентам кампаній пераканаўчыя гутаркі з сялянамі давалі нядрэнны прыбытак, таму часта непісьменных людзей уводзілі ў зман, не распавядаючы ім пра асаблівасці клімату краіны, яе традыцыі і заканадаўства.

Аповеды пра шчаслівае жыццё за мяжой прымушала людзей прадаваць усю сваю маёмасць і збірацца ў падарожжа, таму дадзеную схему вельмі хутка пачалі выкарыстоўваць

аферысты для падману жадаючых эміграваць. Польскія ўлады былі вымушаны прымаць меры і адсочваць парушэнні ў працы мараплаўных агентаў. Пры пацвярджэнні фактаў ашуканства некаторыя з агентаў атрымоўвалі забарону на сваю дзейнасць, часам адкрываліся крымінальныя справы. Напрыклад, у "Справе агента Мар'яна Саварына па абвінавачванні ў ашуканстве эмігрантаў і парушэнні эміграцыйных правіл" [23, л. 90] знаходзяцца дзесяткі пратаколаў паказанняў ашуканых сялян. Гэта быў гучны крымінальны працэс, пра які напісалі шматлікія вядучыя перыядычныя выданні. Прэса прадставіла матэрыял сваім чытачам такім чынам, каб тыя асцярожна і сур'ёзна ставіліся да дзейнасці агентаў.

На масштабы эміграцыйных працэсаў, акрамя палітыкі польскага ўраду і дзяржаў-рэцэпіентаў, аказвала ўплыў агітацыя мараплаўных кампаній і грамадская думка. У справаздачы пра рэкрутацыю сезонных рабочых у Аўстрыю Міністэрства працы і сацыяльнай апекі 18 чэрвеня 1923 г. падкрэслівала: "Важна адзначыць ролю негатыўных аповедаў, якія прывезлі з Аўстрыі некалькі сем'яў, што вярнуліся і распавядаюць на аснове ўласных эмоцый, што засталіся ў Аўстрыі без працы. Яны прадстаўляюць жыццё там не ў самым лепшым святле" [24, л. 6]. Аповеды пра поспехі і няўдачы суайчыннікаў за мяжой фарміравалі ў грамадскай думцы насельніцтва Польшчы вобразы больш спрыяльных для эміграцыі краін. Напрыклад, грамадская думка лічыла больш прыбытковай для эмігрантаў працу ў Францыі, чым у Аўстрыі.

Такім чынам, польскія ўлады выкарыстоўвалі арганізацыю эміграцыйных працэсаў у вырашэнні праблемы перанаселенасці вёскі і памяншэння працэнта нацыянальных меншасцей у краіне. У міжваеннай Польшчы былі створаныя разнастайныя дзяржаўныя і камерцыйныя ўстановы, якія займаліся адпраўкай эмігрантаў за мяжу. Аснову эканамічнай хвалі эміграцыі з тэрыторый Заходняй Беларусі і Заходняй Украінцы складалі сяляне. Большасць эмігрантаў складана праходзіла працэс сацыяльнай адаптацыі, што тлумачыцца непадрыхтаванасцю іх да цяжкога падарожжа і новых умоў жыцця і працы.

**Резюме.** Статья посвящена кругу вопросов, связанных с историей трудовой эмиграции белорусов и украинцев в межвоенный период. Большинство белорусских и украинских эмигрантов были мелкими крестьянами. Адаптируясь в различных странах, белорусы часто присоединялись к действиям украинской диаспоры. Политическая деятельность белорусских сообществ никогда не была высока. Большое внимание обращено на анализ политической ситуации в Польше и организации эмигрантской волны в различных странах.

**Abstract.** This article is about the wide list of questions, connected with the history of formation labour emigration of the Belarusians and the Ukrainians during the inter-war period. Most of Belarusian and Ukrainian emigrants were small-holder peasants. While adapting in different countries the Belarusians often joined the activities of Ukrainian diaspora. The political activity of Belarusian communities was never high. Great attention is paid to the analysis of the political situation in Poland and the organization of emigration wave in different countries.

## Літаратура

1 Качараба, С. П. Еміграція з Західної України 1919–1939 / С. П. Качараба. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2003. – 416 с.

2 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1336. Цыркуляры, інструкцыі і распараджэнні Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення аб правілах эміграцыі за мяжу.

3 Мярчук, В. Ажыццяўленне эміграцыі з тэрыторыі Палескага ваяводства (1920-1930-я гг) / В. Мярчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2010. – № 32. – S. 102.

4 ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 146. Справаздачы фінансавай дзейнасці Эміграцыйнага аддзела за 1931–1934 гг, квартальныя, месячныя бюджэты і ліставанне па фінансавым пытанням.

5 ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 10. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыката аб па-

радку і ўмовах эміграцыі ў Канаду.

6 ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 3. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыката і ліставанне з ім па ўсіх пытаннях дзейнасці аддзелаў.

7 Archiwum Akt Nowych, Ministerstwo Spraw Zewnętrznych, sygn. 9895.

8 Archiwum Akt Nowych, Ministerstwo Spraw Zewnętrznych, sygn. 9898.

9 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1336. Цыркуляры, інструкцыі і распараджэнні Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення аб правілах эміграцыі за мяжу.

10 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1330. Цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў аб правілах рэпатрыяцыі хворых і коштаў іх лячэння.

11 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1330. Цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў аб правілах рэпатрыяцыі хворых і коштаў іх лячэння.

12 Качараба, С. П. Еміграція з Західної України 1919–1939 / С. П. Качараба. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2003. – 416 с.

13 ДАБВ. – Фонд 377. – Воп. 1. – Спр. 1. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыката.

14 ДАБВ. – Фонд 377. – Воп. 1. – Спр. 1. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыката.

15 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1335. Цыркуляры і распараджэнні Эміграцыйнага сіндыката, справаздачы дзейнасці яўрэйскіх эміграцыйных таварыстваў і спісы эмігрантаў.

16 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1337. Распараджэнні і інструкцыі Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення аб правілах эміграцыі грамадзян у еўрапейскія краіны.

17 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1337. Распараджэнні і інструкцыі Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення аб правілах эміграцыі грамадзян у еўрапейскія краіны.

18 ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1337. Распараджэнні і інструкцыі Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення аб правілах эміграцыі грамадзян у еўрапейскія краіны.

19 ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 5. Цыркуляры і распараджэнні Эміграцыйнага сіндыката аб парадку і ўмовах эміграцыі.

20 ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 6. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыката і ліставанне з ім па ўсіх пытаннях дзейнасці аддзела.

21 Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў г. Львове (ЦДГА Украіны ў г. Львове). – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 2958. – Справа агента Саверына Мар’яна па абвінавачванні ў ашуканстве эмігрантаў і парушэнні эміграцыйных правіл.

22 ЦДГА Украіны ў г. Львове. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 2967. – Ліставанне, пратаколы і іншыя матэрыялы пра разгляд фактаў парушэння правіл эміграцыі агентамі параплаўных таварыстваў.

23 ЦДГА Украіны ў г. Львове. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 2958. – Справа агента Саверына Мар’яна па абвінавачванні ў ашуканстве эмігрантаў і парушэнні эміграцыйных правіл.

24 ЦДГА Украіны ў г. Львове. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 565. – Матэрыялы пра выкананне польска-аўстрыйскага дагавора пра адпраўку польскіх сельскагаспадарчых працоўных на работу ў Аўстрыю Эміграцыйным упраўленнем у Варшаве.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.01.10